
© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017



Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

МАСАВА-ПАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК

Газета Слонімская

№35 (325) 28 жніўня—3 верасня 2003 г. Наклад 11.350 экз. Кошт 400 руб.

«ГАЗЕТУ СЛОНІМСКУЮ» ЧЫТАЮЦЬ Слонім, Зэльва, Дзятлава, Масты, Ваўкавыск, Шчучын, Ліда, Гродна, Баранавічы, іншыя гарады Беларусі, а таксама на HTTP://gs.promedia.by

АНОНС

КУРСЫ ОБМЕНА ВАЛЮТ ПО СОСТОЯНИЮ НА 26.08.2003 ГОДА

"Беларусбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	2080	2115
1 EURO	2220	2320
1 ZL	500	530
1 RUR	66,5	69,5
оао "Белпромстройбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	2090	2110
1 EURO	2250	2340
1 ZL	505	540
1 RUR	67	69,3
"Белагропромбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	2085	2115
1 EURO	2230	2320
1 ZL	490	550
1 UAH	360	400
1 RUR	67	69,5
Нацбанк РБ		
1 USD	2087	
1 EURO	2271,6	
1 RUR	68,87	

В НОМЕР

ИВАН ТИХОН – ЧЕМПИОН МИРА!



■ Заключительная попытка Ивана Тихона на 83,05 м

Наконец-то удача улыбнулась нашему земляку Ивану Тихону.

В понедельник, 25 августа, на чемпионате мира по легкой атлетике в Париже состоялся финал среди метателей молота. С результатом 83 метра 05 сантиметров в этой дисциплине Иван Тихон уверенно победил и стал чемпионом мира 2003 года. Кстати, кроме Ивана участие в чемпионате принимали еще два белорусских молотобойца: Игорь Астапкович и Вадим Девятовский. Второе место занял венгр А.Аннуш, третье – японец Мурофуши.

Родился Иван Тихон 24 июля 1976 года в деревне Гловсевичи Слонимского района. Он участник чемпионата мира 2001 года (23-е место), Олимпийских игр в Сиднее (4-е место). Личный рекорд Ивана и его лучший результат сезона-2003 – 84,32 м. Долгое время Тихон тренировался у Игоря Цыцорина, а последний тренер – Сергей Литвинов.

Валерий КОВАЛЕНКО

ЗА ДОБРУЮ ПРАЦУ

ВЫХОЎВАЮЦЬ ПАТРЫЁТАЎ

Настаўніца фізікі і матэматыкі Партызанаўскай базавай школы Сафія Роўба і дырэктар СШ №9 горада Слоніма Любоў Слюсарава за добрасумленную працу па патрыятычнаму выхаванню моладзі будуць узнагароджаны Ганаровай граматай аблвыканкама.

Аблвыканкам прыняў рашэнне аб узнагародзе настаўнікаў вобласці, якія вызначыліся ў выхаванні маладых патрыётаў, перад пачаткам навучальнага года. На Слонімшчыне ў гэты спіс трапілі толькі два педагога.

А вось настаўніцу рускай мовы і літаратуры Рахавіцкай сярэдняй школы Аліну Іванаўну Несцер і дырэктара слонімскай СШ №7 Надзею Андрэеўну Сяркевіч узнагародзяць Падзячным лістом старшыні аблвыканкама за добрасумленную працу і заслугі ў педагагічнай і выхаваўчай дзейнасці.

Мікола КАНАНОВІЧ

ЗА ОТВАГУ

ЗАСЛУЖЕННАЯ НАГРАДА САПЕРА



Фота з архіва "ГС"

■ Владимир Лямзин

Старший прапорщик инженерно-саперного батальона 11 механизированной бригады Владимир Лямзин представлен к награждению медалью «За адвагу».

Всего в Беларуси эту награду получили 18 человек, Владимир Лямзин станет девятнадцатым. И эту боевую медаль он получит совершенно заслуженно, поскольку, будучи сапером, постоянно сталкивается с опасностью.

Начиная с 1995 года, старший прапорщик Лямзин обезвредил 2 217 снарядов, бомб, гранат и других боеприпасов, оставшихся на белорусской земле с Великой Отечественной войны. Только за прошлый, 2002 год, на счету слонимского сапера 187 обезвреженных боеприпасов, из них 135 – под водой. Кстати, Владимир Лямзин едва ли не единственный в Беларуси сапер, занимающийся подводным разминированием.

Валерий КОВАЛЕНКО

Лиц № 30 от 30.11.99г. до 30.11.04г., СПИК
ТЕХНИКА для ДОМА И ОФИСА
ФОРМА ОПЛАТЫ - наличный, б/наличный расчёт, чековая книжка.
2-15-30 г. Слоним, ул Советская,8

Лиц № 30 от 30.11.99г. до 30.11.04г., СПИК
Магазин г. Слоним, ул. Первомайская, д.3.
ФОРМА ОПЛАТЫ - наличный, б/наличный расчёт, чековая книжка.
Всё для стройки и ремонта
2-30-00

ПОСТОЯННО ОРГАНИЗОВЫВАЕМ ПОЕЗДКИ
т.222-99, 250-05, (8029)-6551499, 6651499
МИНСК Медицинский институт, Институт культуры, Центр
Пышки, Рынок, Центр ГРОДНО
т. 250-05, 222-99, (8029)-6574024
ПОЕЗДКИ ПО РБ. НАДЕЖНО, КОМФОРТНО, БЕЗОПАСНО на автобусах Форд-Транзит, Мерседес-Спринтер (15 мест)
ПРЕВРАТИ СВОЮ ПОЕЗДКУ В МАЛЕНЬКОЕ ПУТЕШЕСТВИЕ

ПОЕЗДКИ ЕЖЕДНЕВНО
Гродно Минск Слоним
тел. 44-2-88
8-0296-20-32-70
Лиц. №5-0196, 25.02.98-25.02.03, МТК РБ.

Организовываем поездки на а/м "Форд-Транзит" в ГРОДНО
ЕЖЕДНЕВНО 15 мест.
Принимаем заявки по перевозке пассажиров по РБ.
Запись по тел.: 2-92-18, 8-0296-78-09-72.
Лиц. № 5-0474, 15.07.02г.-14.07.04г. МТК РБ

РЭКЛАМА • • • РЭКЛАМА • • • РЭКЛАМА • • • РЭКЛАМА • • • РЭКЛАМА • • • РЭКЛАМА • • • РЭКЛАМА • • • РЭКЛАМА

ООО «БЕЛМЕДДИАФАРМ» Лиц. №1520 от 20.03.2000г.-20.03.2005г. МЗ РБ
КОДИРОВАНИЕ БИОЛОГИЧЕСКОЕ. «Двойной блок». Внутривенное, внутримышечное подшивание.
ИГЛОРЕФЛЕКСОТЕРАПИЯ (алкоголизм, табакокурение, избыточный вес, невралгия).
Тел. 8-017-238-87-56, 8-0296-75-75-03

Осуществляем поездки в г. Гродно
автобусом "Форд-Транзит" (15 мест). Принимаем заказы на обслуживание коллективных мероприятий.
Запись по тел. 5-24-45 8-029-630-76-60
Лиц. № 5-0482, 02.08.02г.-01.08.07г. МТК РБ

Регулярный маршрут Слоним – Гродно
Дни следования: пн., вт., пт., сб., вс.
Справки по тел. 5-28-23 8-0296-67-37-85.
Лиц. АВ №0566, 12.03.2003г.-11.03.2008г. МТК РБ

РЕГУЛЯРНЫЙ МАРШРУТ Слоним – Минск
на а/м «Форд-Транзит» (пн., ср., чт., пт., сб., вс.)
Отправление из Минска а/в "Восточный" в 17.10
Запись по тел.: 5-31-32, 8-02968-5-33-32
Лиц. АВ №5-0539, 26.02.2003г.-25.02.2008г. МТК РБ

ГАЛАКТИКА аудио, видео, бытовая техника
Торговый павильон: рынок РПО, ул. Школьная, 2
Форма оплаты любая
8-029-6-823-723
8-029-66-585-66


© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

СІТУАЦЫЯ

КАНФЛІКТ З-ЗА КРЫЖА ПРАЦЯГВАЕЦЦА

У аўторак, 26 жніўня, каля магазіна вёскі Парэчча адбыўся сход мясцовых жыхароў, якія з заявою звярнуліся да старшыні Васілевіцкага сельскага Савета аб тым, што яны незадаволены крыжам, які стаіць побач з мемарыяльным знакам, прысвечаным беларускаму рэвалюцыянеру, удзельніку паўстання 1830-31 гадоў, ураджэнцу вёскі Парэчча Міхалу Валовічу.


Фота Таццяны ПЛАХЕТКА

■ Спрэчкі наконт крыжа ў Парэччы


Сход пачаў старшыня мясцовага Савета Васіль Падрэцкі, які расказаў прысутным аб той сітуацыі, якая ўзнікла. Айцец Пётр мясцовага праваслаўнага прыходу выступіў і прапанаваў зняць крыж, матывуючы гэта тым, што крыжы ставяцца толькі на магілах памерлых, а калі тут магілы Валовіча няма, дык і крыж не патрэбны. Яго падтрымалі некалькі ўзбуджаных вяскоўцаў.

Гісторык, аўтар кнігі "Парэчча" Аляксандр Талерчык растлумачыў сваім землякам, што крыж каля мемарыяльнага знака пастаўлены праваслаўны і расказаў пра Міхала Валовіча. Дарэчы, на працягу трох гадоў некалькі разоў невядомыя знішчалі крыжы на месцы мемарыяльнага знака славутаму беларусу. І тым, хто іх ставіў, каб ушанаваць яго памяць, прыйшлося нават звяртацца з заявамі ў міліцыю. Але вінаватых пакуль так і не знайшлі.

У той дзень да адзінай думкі людзі не прыйшлі. А найбольш крычалі супраць крыжа, як пасля высветлілася, тыя, хто далёка не адсюль родам. А мясцовыя старажылы: бабулі, дзядулі ды і іншыя жыхары ў дадзенай сітуацыі проста заставаліся манкуртамі.

Сяргей ЧЫГРЫН

ОАО «Сберегательный банк «Беларусбанк»



Филиал №422 г.Слоним
БЕЛАРУСБАНК

С 11.08.03 **ЗНАЧИТЕЛЬНО СНИЖЕНЫ (на 5-9%)** процентные ставки по кредитам:

- НА РЕМОНТ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ:
на срок до 5 лет - ~~42%~~ -36% годовых

- НА ПОТРЕБИТЕЛЬСКИЕ НУЖДЫ (приобретение мебели, электробытовой техники, одежды, продуктов питания):
на срок до 3-х лет - ~~45%~~ -36% годовых

- НА ТЕЛЕФОНИЗАЦИЮ, приобретение мобильных телефонов, тел. аппаратов и подключение к тел. сетям:
на срок до 3-х лет - ~~45%~~ -36% годовых

- НА ОПЛАТУ ЛЕЧЕНИЯ, приобретение лекарств, приборов медицинской техники:
на срок до 3-х лет - ~~40%~~ - 32-36% годовых

- НА САНАТОРНО-КУРОРТНОЕ ЛЕЧЕНИЕ, отдых и туризм:
на срок до 3-х лет - ~~50%~~ -36% годовых

- НА РАЗВИТИЕ ЛИЧНОГО ПОДСОБНОГО ХОЗЯЙСТВА:
на срок до 3-х лет - ~~39%~~ -36% годовых

- НА ПРИБРЕТЕНИЕ ТРАНСПОРТНЫХ СРЕДСТВ (мотоцикла, автомобиля, микроавтобуса, прицепа):
на срок до 3-х лет - ~~52%~~ -36% годовых

За дополнительной информацией о порядке предоставления кредитов Вы можете обратиться в отдел кредитования по адресу: **г.Слоним, ул. В.Крайнего,19 каб. №8 или по тел. 2-34-39**

Только наша кредитная поддержка окажет помощь В РЕШЕНИИ ВАШИХ СЕМЕЙНЫХ ПРОЕКТОВ

Ген.лиц. НБ РБ № 31 от 01.04.2002 г. Общая лиц. НБ РБ № 56 от 01.04.2002 г.

АКТУАЛЬНО

ПОЛДНЯ В «ШКУРЕ» ВИЧ-ИНФИЦИРОВАННОГО

Затрагивать медицинские темы в газетных публикациях всегда сложно. А для неспециалиста и подавно. Но это если говорить о специфических вопросах, к примеру, о профилактике или лечении той или иной болезни.


Фота Таццяны ПЛАХЕТКА

■ Постричься мне и здесь не удалось

Другое дело, если говорить о моральном, человеческом аспекте отношения общества к больному смертельным недугом. Да, я имею в виду ВИЧ-инфицированных. Не тех, кто едва угадывается за статистическими выкладками и сухими, хоть и пугающими, цифрами. А тех, кто обличен реальной внешностью и ежедневно находится поблизости с нами. И жизнь наша спокойна, пока мы не знаем их в лицо. Но стоит только ВИЧ-инфицированному признаться в своей болезни, и он становится изгоем. Общество старается отторгнуть его как инородное тело и прячет свой страх за стеной непонимания.

Оставить человека один на один со своей проблемой, а вернее — бедой (поскольку проблема эта наша общая), легко. А каково приходится ВИЧ-инфицированному, если он не скрывает болезнь, справляться с кучей повседневных мелочей на бытовом уровне, известно лишь ему одному. Этого не поймешь, пока не поставишь себя на место «зачумленного». Что и попытался сделать корреспондент «ГС» в прошлую пятницу.

И для начала я решил постричься. В парикмахерской в центре Слонима (над фотостудией «Кодак») после того, как я предупредил кассира, что я ВИЧ-инфицирован, пришлось услышать отказ: «Мы таким людям своих услуг не предоставляем. Хотите постричься — ищите личного парикмахера». Столь же категоричный ответ прозвучал и из уст мастера в парикмахерской в подвальчике на улице Карла Маркса. Более того, в глазах этой девушки читался откровенный испуг.

Более спокойно отнеслась ко мне парикмахер из «Белого дома», — просто сказала, что таким людям услуг они не оказывают, мол, зачем нам неприятности, а напоследок пожелала выздоравливать. Кстати, в ее практике были случаи, когда приходили постричься носители СПИДа, представлялись и, соответственно, получали отказ. Если же ВИЧ-инфицированный не признается в своем заболевании, то все возможные последствия остаются на его совести.

В общем, в наших парикмахерских мне было неуютно. Взяться за мою прическу не решился никто, поскольку нет никаких инструкций на этот случай, нет одноразовых инструментов (тех же ножниц) и нет желания на такой близкий контакт, как стрижка. В парикмахерской городской бани мне так прямо и сказали: «После вас мне придется на день закрываться, чтобы все продезинфицировать».

А вот в баньке помыться мне, как ВИЧ-инфицированному, оказалось, можно. Точно так же можно совершенно свободно полечить зубы в стоматологической поликлинике. Тут к каждому пациенту относятся как к потенциальному носителю вируса иммунодефицита, и потому в поликлинике налажен строжайший контроль за стерильностью инструментов. А, значит, и опасность заражения сведена к минимуму.

Да только легче от этого не становится. Проблема дискриминации (иначе и не назовешь) ВИЧ-инфицированных существует, но решать ее, похоже, никто серьезно не собирается. И пока существует дискриминация, удобнее вообще не знать своего ВИЧ-статуса или же скрывать его, чтобы не доставлять себе хлопот. А что там будет с иными здоровыми согражданами, то это уже не забота больного.

Эти мысли настойчиво крутились в голове, пока я был в «шкуре» ВИЧ-инфицированного. Теперь же мне интересно, как меня встретят в той же парикмахерской, ну, где-то так через неделю, когда постричься захочу уже я-здоровый? Не придется ли справку предъявлять?

Валерий КОВАЛЕНКО

НАВІНА

МЭР ГРОДНА ШПІТАЛІЗАВАНЫ

Старшыня Гродзенскага гарвыканкама Аляксандр Антоненка знаходзіцца ў кардыялагічным аддзяленні першага гарадскога клінічнага шпіталя, куды ён быў дастаўлены ў панядзелак з прыступам стэнакардыі.

— Зараз стан яго здароўя нармалізаваўся, — паведаміў галоўны ўрач першай гарадской клінічнай бальніцы Уладзімір Курбаеў. – Аднак, у шпіталі мэр прабудзе, як мінімум, тыдзень, а можа і больш.

Па словах Уладзіміра Курбаева, сардэчны прыступ у Аляксандра Антоненкі здарыўся яшчэ ў пятніцу, аднак да панядзелка мэр адмаўляўся ад шпіталізацыі. У 49-гадовага старшыні гарвыканкама раней ніколі не было праблемаў з сэрцам.

Як паведамілі нам у прыёмнай Аляксандра Антоненкі, гарвыканкам працуе ў звычайным рэжыме. Абавязкі старшыні гарвыканкаму цяпер выконвае Анатоль Кунаш, першы намеснік мэра горада.

Юлія ДАРАШКЕВІЧ

ЗДАРЭННЕ

НАСЯКОМЫЯ НАПАДАЮЦЬ НА ЛЮДЗЕЙ

19 выпадкаў нападу восаў і шэршняў на людзей зафіксавалі на мінулым тыдні ў Гродзенскім абласным упраўленні МНС. Ад укусаў насякомых пацярпела пенсіянерка з вёскі Панямунь Гродзенскага раёна.

Тры разы ратавальнікі выязджалі па выкліку ў гродзенскія дзіцячыя садкі. Памяшканні былі апрацаваны дыхлафосам, а асіныя гнёзды замураваныя.


Надзвычайную актыўнасць насякомых супрацоўнікі Цэнтра прапаганды і навучання пры Гродзенскім абласным упраўленні МНС звязваюць з глабальным пацяпленнем клімату.

Юлія ДАРАШКЕВІЧ

НУ І НУ!

СЫРОК З ЦВІЛЛЮ

Неадназова наша газета пісала аб тым, што ў некаторых харчовых магазінах Слоніма прадаюцца сапсаваныя прадукты харчавання, асабліва малочна-кіслотныя. Тым не менш, прадукты, тэрмін ужывання якіх прайшоў, па-ранейшаму залежваюцца на прылаўках магазінаў, і прадаўцы не спяшаюцца іх здымаць з рэалізацыі.



У мінулы аўторак адзін з нашых чытачоў прынёс у рэдакцыю плаўлены сырок "Столовый" за 530 рублёў, які ён купіў у магазіне "Пралеска", што ў Лабазоўцы. Сырок аказаўся цвілым, але прадаўцы на гэта не звярнулі ўвагі. Мужчына купіў яшчэ некалькі сыркоў, і яны таксама былі з цвіллю. На заўвагу старэйшая змены крамы адказала, што калі ён цвілы, дык трэба яго ўбраць. Лагічна. Але за якасцю прадуктаў павінны сачыць і несці адказнасць прадаўцы, а не пакупнікі. Трэба нагадаць, што ў гэтым годзе ў некаторых рэгіёнах краіны былі зарэгістраваны факты, калі некалькі сот чалавек атруцілася падобнымі прадуктамі.

Дарэчы, некалькі псаваных сыркоў наш чытач занёс і ў Слонімскі цэнтр гігіены і эпідэміялогіі. Спадзяемся, што супрацоўніцы цэнтра з гэтым і падобнымі фактамі разбяруцца.

Сяргей ЧЫГРЫН

Дзейнічае
грамадская праваабарончая прыёмная.
Звяртайцеся па чацвяргах з 18.00 да 22.00 па тэл. 2-42-78.

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

НАВІНЫ ДАІ

ДАРАЖЭЙ ЎСЁ, І ВАДЗІЦЕЛЬСКАЕ ПАСВЕДЧАННЕ ТАКСАМА

З 15 жніўня пачалі дзейнічаць новыя стаўкі збораў з уладальнікаў транспартных сродкаў за паслугі , якія аказвае Дзяржаўная аўтаінспекцыя МУС Беларусі. Аб гэтым карэспандэнту "ГС" паведамілі ў аддзяленні ДАІ Слонімскага РАУС.

Нумарны знак на аўтатранспартныя сродкі стаў каштаваць 17 тысяч рублёў, на маторатранспартную тэхніку — 7 тысяч, на прычэпы — 8500 беларускіх рублёў.

Вадзіцельскае пасведчанне з талонам да яго і пасведчанне аб рэгістрацыі транспарту абыдуцца ўладальніку па 10 тысяч рублёў кожнае, талон да вадзіцельскага пасведчання — 1 000 рублёў.

За экзамен па правілах дарожнага руху неабходна заплаціць 1000 руб., па кіраванню аўтамабілем — 2000 руб., па кіраванню матацыклам — 1000 руб.

Тыя вадзіцелі, якія маюць жаданне на свой аўтамабіль заказаць спецыяльны рэгістрацыйны знак з жадаемай камбінацыяй лічбаў і літараў, выробленых у індывідуальным парадку, павінны выкласці з уласнай кішэні ажно 500 амерыканскіх даляраў.

Сяргей ЧЫГРЫН

ОПЕРАЦИЯ ГАИ

ВНИМАНИЕ, ДЕТИ!

С начала года в Слониме и Слонимском районе зарегистрировано две аварии, в результате которых два ребенка получили телесные повреждения. В то же время в Гродненской области произошло 75 ДТП, при которых 4 подростка погибли, 78 получили телесные повреждения.

По словам инспектора Слонимской госавтоинспекции Сергея Шевчика, с 27 августа по 5 сентября на территории республики Беларусь будет проводиться операция "Внимание! Дети идут в школу!". В ходе данной операции обследуются улицы в районе расположения школ, далеких учебных заведений с целью предупреждения детского дорожно-транспортного травматизма.

Сотрудники ГАИ также будут проводить встречи со школьниками, с ребятами из дошкольных учреждений и т.д.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ЗДАРЭННЕ

ЗНЯЎ БАРТЫ З ПРЫЧЭПА

Два алюміневыя прычэпныя барты ад аўтамабіля "Мэрседэс" зняў 21 жніўня ў Рышчыцах мясцовы жыхар.

Аднак скарыстацца украдзеным злодзей не паспеў. Работнікі міліцыі хутка ўстанавілі яго асобу.

Мікола КАНАНОВІЧ

ЗДАРЭННІ

ЖНІВЕНЬСКІЯ ТРАГЕДЫІ НА ДАРОГАХ



Фота Валерыя КАВАЛЕНКІ

■ Перавернуты "VW-Пасат" на вуліцы Чкалава

Сёлетні жнівень быў вельмі неспакойным і трывожным для супрацоўнікаў аддзялення ДАІ Слонімскага РАУС і трагічным для пешаходаў і вадзіцеляў.

10 жніўня, як ужо пісала наша газета, пад коламі легкавушкі загінула 21-гадовая слонімская дзяўчына. Не паспелі сціхнуць у горадзе чуткі пра гэта ДТЗ, як 19 жніўня адбываецца новая трагедыя на Чырвонаармейскай вуліцы каля дома № 267. Пры невядомых абставінах машына збівае 27-гадовую жанчыну, а вадзіцель, які гэта зрабіў, з месца здарэння ўцёк. Жанчына памерла на месцы.

20 жніўня на вуліцы Чкалава перавярнуўся аўтамабіль "VW-Пасат", за рулём якога знаходзіўся супрацоўнік слонімскага гарадскога аддзела аб'яднання "Ахова". 37-гадовая жанчына, якая знаходзілася ў машыне, атрымала траўму галавы і была дастаўлена ў бальніцу.

Страшная аварыя адбылася каля вёскі Вербалаты. Дзве маладыя асобы прыехалі ў Глоўсевічы, каб "замачыць" нараджэнне немаўляці. Маленькая дзіця яны пакінулі ў знаёмых, а самі сталі адзначаць з сябрамі радасную падзею. Пасля застолля маладыя людзі селі ў машыну, якая, дарэчы, аказалася ўкрадзенай, і паехалі ў бок Слоніма. Недалёка ад Вербалацкай фермы, вадзіцель не справіўся з кіраваннем і машына перакулілася. У выніку, 23-гадовая жанчына, якая знаходзілася ў салоне аўтамабіля, памерла на месцы. Дарэчы, сіратой засталося немаўля. Сам вадзіцель з траўмамі схаваўся ў хляве. Праўда, праз пэўны час яго затрымалі.

Толькі 24 жніўня на Слонімшчыне супрацоўнікі мясцовай ДАІ затрымалі 10 вадзіцеляў у нецвярозым стане. Усе яны пазбаўлены вадзіцельскіх пасведчанняў.

Сяргей ЧЫГРЫН

ТРОЕ ДЗЯЦЕЙ ЗАГІНУЛА ПАДЧАС ПАЖАРАЎ

Як паведамляла "ГС", двое дзяцей задыхнулася дымам у кватэры ў вёсцы Верусіна Ваўкавыскага раёна. Здарэнне адбылося позна ноччу.

Жанчына пайшла ў суседнюю вёску, пакінуўшы чатырохгадовага Жэню і двухгадовую Кацю адных у хаце. Калі ў дзве гадзіны ночы кабета вярнулася дахаты, кватэра была ахоплена дымам, а дзеці былі без прытомнасці. Маці вынесла малых з кватэры і разам з суседзямі спрабавала рабіць ім штучнае дыханне, аднак дзеці памерлі да прыезду медыкаў. Прычынай узгарання стала неасцярожнае абыходжанне дзяцей з агнём.

Другі выпадак, калі ахвярамі агню сталі дзеці, адбыўся ў вёсцы Свірыдавічы Смаргонскага раёна, дзе падчас пажару загінуў 10-гадовы хлопчык.

Пажар у драўлянай хаце, дзе знаходзіліся двое пенсіянераў і двое іх унукаў, распачаўся ў дзве гадзіны ночы ад кароткага замыкання электраправодкі ў кладоўцы. Старыя і дзяўчынка, якія спалі ў адным пакоі, здолелі выбрацца на падворак. Фатальнай памылкай стала тое, што яны пачалі біць шыбы. У выніку, свежае паветра распаліла агонь, які імгненна ахапіў усю хату. 10-гадовы хлопчык з агню выбрацца не здолеў, ратавальнікі знайшлі яго ўжо мёртвым.

Паводле інфармацыі Цэнтра прапаганды і навучання пры Гродзенскім абласным упраўленні МНС, Гродзеншчына займае першае месца ў рэспубліцы па колькасці загінуўшых у агні. Па словах Анатоля Бахарэвіча, начальніка Цэнтра, назіраецца тэндэнцыя павелічэння колькасці ахвяраў агню. Калі за восем месяцаў мінулага года ў агні на Гродзеншчыне загінула 80 чалавек, сярод якіх 4 дзіцяці, то з пачатку бягучага года колькасць ахвяраў агню павялічылася да 107 чалавек. Сёлета ў вобласці на пажарах загінула 7 дзяцей.

Юлія ДАРАШКЕВІЧ

ЗДАРЭННІ

УКРАЎ МАРМУРОВУЮ ПЛІТУ З "БЕЛАГА ДОМА"

Ноччу 23 жніўня слонімец С. аддзёр ад сходаў райвыканкама мармуровую пліту і панёс дамоў. Па дарозе яго разам з ношай затрымалі работнікі міліцыі.

Цяпер мужчына тлумачыць праваахоўным органам, для чаго яму спатрэбілася пліта ад будынка мясцовай улады.

ПАХУЛІГАНІЛІ НА КАМСАМОЛЬСКАЙ

На мінулым тыдні на вуліцы Камсамольскай нехта ўкраў з цеплатрасы ліст бляхі. На гэтай жа вуліцы невядомыя разбілі ў вокнах кацельнай шкло.

Па дадзеных фактах праводзіцца праверка.

РАЗУКАМПЛЕКТАВАЛІ РУХАВІК

На тэрыторыі Слонімскага матора-рамонтнага завода работнікі аб'яднання "Ахова" затрымалі групу непаўналетніх, якія разукамплектоўвалі трактарны рухавік.

Якім чынам падлеткі пранiклі на тэрыторыю прадпрыемства і навошта ім спатрэбіліся дэталі ад трактарнага матора, высвятляюць работнікі міліцыі.

ЗА ТЫДЗЕНЬ ЗНІКЛІ ТРЫ ВЕЛАСІПЕДЫ

За мінулы тыдзень у міліцыю паступілі тры заявы аб крадзяжах веласіпедаў. Адзін з гаспадароў пазбавіўся сваёй двуколкі 22 жніўня і двое — 23-га.

Як паказвае статыстыка ўгонаў, з усіх відаў транспарту веласіпеды на Слонімшчыне крадуць найбольш.

БУЛЬБУ КРАДУЦЬ НЕ ТОЛЬКІ Ў ПРЫВАТНІКАЎ

У міліцыю працягваюць паступаць заявы аб крадзяжах сельгаспрадукцыі з палёў і агародаў. Ад сезонных злодзеяў цярпяць не толькі прыватнікі, але і калектыўныя гаспадаркі.

Так на мінулым тыдні пра крадзеж саломы паведаміла кіраўніцтва "АТФ Шчара", а ў СВК імя Суворава невядомыя накапалі калгаснай бульбы. Па дадзеных фактах праводзіцца праверка.

АЎТАМАБІЛЬ УГНАЛІ З ГАРАЖА

У ноч на 23 жніўня з гаражнага кааператыва "Эдэльвейс" быў угнаны аўтамабіль "Фольсваген-Пасат".


Уладальнік легкавушкі паставіў аўтамабіль на ноч у гараж і замкнуў дзверы. Аднак замок не стаў для злодзея перашкодай. Цяпер пошукам угнанай машыны займаюцца работнікі крымінальнага вышуку. Аператыўнікі звяртаюцца з просьбай да магчымых сведак угону падзяліцца інфармацыяй па тэлефонах 2-18-02; 02 альбо непасрэдна звярнуцца ў райаддзел міліцыі.

Мікола КАНАНОВІЧ

НАВІНА

ГОСЦІ З ГЕРМАНІІ

На мінулым тыдні ў рэдакцыі нашай газеты пабывала сям'я Шухардтаў з Германіі.



Фота Таццяны ПЛАХЕТКА

■ Уладзімір Шухардт

Справа ў тым, што Уладзімір Шухардт цікавіцца гісторыяй сваіх продкаў, якія былі родам са Слонімшчыны. Яго бацька ў 1939 уцёк на Захад ад бальшавікоў. Жывучы там, ён вельмі шмат расказваў пра Беларусь, пра тыя мясціны, дзе нарадзіўся і рос, дзе засталіся магілы яго далёкіх продкаў.

Уладзімір Шухардт наведаў Беларусь упершыню, разам з ім да нас прыехалі яго сын Мікалай і дачка Ірына. Госці паказалі сямейны альбом сваіх сваякоў, старыя фатаздымкі Зэльвы і Слоніма. Сам Уладзімір Шухардт па адукацыі філолаг, закончыў універсітэт у Мюнстэры, працуе ў галіне культуры і адукацыі. На пытанне, што іх найбольш здзівіла падчас паездкі па Беларусі, госці сказалі, што мытня, дзе яны затрацілі ажно тры гадзіны свайго часу.

Сяргей ЧЫГРЫН

Магазин «Агат»
(комиссионные товары из Европы)
Предлагаем широкий выбор мужской, женской и детской одежды и обуви из Англии.
В ассортименте около 2-х тысяч изделий.
Цены очень доступные.
Новые поступления - вторник, пятница
Ждём вас по адресу: ул. Маяковского, 6 (напротив центральной почты).
Время работы: 10.00-18.00, обед 14.00-15.00, выходной-понедельник.
Магазин «Бриз»
(комиссионные товары из Европы)
Наш ассортимент удовлетворяет любой вкус
(вход за магазином «Рубин»), ул. Красноармейская, 42
Тел. 5-33-83
Время работы: 10.00-18.00, обед 14.00-15.00, выходной - воскресенье
Лиц. № 32, до 25.04.2008г. СРИК

магазин Мастер
огромный выбор
СВЕТИЛЬНИКИ
ДВЕРИ металлические, из дерева
ОКНА
оконная и дверная ФУРНИТУРА
СМЕСИТЕЛИ для кухни, ванны
качество высокое
цены доступные
наличный и безналичный расчет
УЛ. КУПАЛЫ,5
Т. 4-63-89; 8-0296-589179

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

ЮРИСТ ОТВЕЧАЕТ

Вопрос — Ответ



▪ Сергей ГЕРАСИМЧИК, юрисконсульт «Газеты Слонімскай»

ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ СУСЕД СВАЮ КВАТЭРУ ЗРАБІЎ СМЕТНІКАМ

"У нашым пад'ездзе жыве жанчына М., якая ўжо на працягу 10 год носіць у сваю кватэру змесціва са сметніцы нашага мікрараёна. У пад'ездзе стаіць адпаведны пах. З 1996 года мы звярталіся ў розныя інстанцыі. У 1998 годзе пры дапамозе камітэта грамадскага самакіравання, пракуратуры, ЖЭСа, міліцыі, пажарнікаў была ачышчана калясачная ад падобнага смецця, прынесенага М. Наконт жа кватэры нам адказваюць – няма закона, каб без дазволу гаспадыні наводзілі парадак у яе кватэры. Але ж калі, крый Божа, выбухне газ, узнікне пажар, эпідэмія ці якая іншая пошасць, то "закон" адразу знойдзецца. Дык навошта чакаць бяды?

А пытанне да юрысконсульта «ГС» наступнае:

***а)** ці ёсць закон, які ў дадзеным выпадку абараняе правы астатніх жыльцоў пад'езда?*

***б)** калі такога закона няма, то ці можам мы ініцыяраваць прыняцце адпаведнага закона?".*

Міхась ВАРАНЕЦ, жыхар мікрараёна "Энка", г. Слонім

а) ці ёсць закон, які ў дадзеным выпадку абараняе правы астатніх жыльцоў пад'езда?

Такие законодательные акты в Республике Беларусь приняты. В соответствии с п.1 ст. 272 Гражданского кодекса, собственник осуществляет права владения, пользования и распоряжения принадлежащим ему жилым помещением в соответствии с его назначением. А согласно пп. 2 и 3 ст. 272 ГК, жилые помещения предназначены лишь только для проживания граждан, т.е. запрещено жилое помещение использовать в иных целях (например, складировать мусор). Согласно ст. 124 ЖК РБ, отношения собственников жилых помещений в многоквартирном жилом доме регулируются ГК РБ, Законом РБ "О совместном домовладении" и иным законодательством.

Ответственность за нарушение жилищного законодательства устанавливается ЖК РБ, административным, уголовным и иным законодательством (ст.125 ЖК). В ст. 126 ЖК предусмотрены виды правонарушений, за которые в области жилищных отношений предусматривается ответственность (например, **нарушение правил пользования жилыми помещениями, содержания жилых помещений и вспомогательных помещений жилого дома, пожарной безопасности и иных правил; самоуправство в реализации своих интересов и ущемление законных прав и интересов других граждан и их организаций**). В стране действуют также Правила пользования жилыми помещениями, содержания жилых и вспомогательных помещений жилого дома в Республике Беларусь, утвержденным приказом Министерства ЖКХ РБ 07.12.1999 N177, за нарушение которых предусмотрена административная, уголовная и иная ответственность (например, ст. 141 Кодекса РБ об административных правонарушениях).

б) калі такога закона няма, то ці можам мы ініцыяраваць прыняцце адпаведнага закона?

Да, можете. Согласно ст. 99 Конституции, гражданам РБ, обладающим избирательным правом, в количестве не менее 50 тысяч человек (**изменений и дополнений в Конституцию, не менее 150 тысяч граждан РБ, обладающих избирательным правом (ст. 138 Конституция)**), принадлежит право законодательной инициативы, которое реализуется ими в Палате представителей (нижняя палата Парламента РБ).

КАКИЕ МОИ ПРАВА?

Распространяются ли дополнительные права и гарантии, предусмотренные законодательством РБ, на работников, которые работают у индивидуальных предпринимателей?

Павел Трофимович КРУПЕНИЧ, председатель общественного совета ЖЭС-1, г. Слоним

Да, распространяются. Для этого необходимо, чтобы работник находился в трудовых отношениях с нанимателем. Трудовое законодательство содержит ряд дополнительных прав (гарантий) для работников (например, право на трудовые и социальные отпуска (ст. 149 ТК); право на получение пособия по временной нетрудоспособности; право на получение денежной компенсации за неиспользованный трудовой отпуск (ст. 179 ТК); т.п.), **как общее право всех наемных работников, независимо от того, кто является их нанимателем(!),** независимо от вида заключаемого ими трудового договора, формы организации и оплаты труда. Следовательно, права и гарантии, предусмотренные законодательством для работников, не зависят от сферы приложения труда, организационно-правовой формы нанимателя, срока трудового договора (неопределенный или определенный срок, время выполнения определенной работы), режима работы, условий труда, степени занятости, занимаемой должности, форм и систем оплаты труда, размера заработной платы и других условий трудовых отношений.

Однако, если работники (исполнители) состоят в гражданско-правовых отношениях с индивидуальными предпринимателями (работают по договорам подряда, оказания услуг), то гарантии, предусмотренные трудовым законодательством, на них не распространяются, поскольку они не связаны с предпринимателями трудовыми правоотношениями (!).

ПРЕДПРИЯТИЕ ЛИКВИДИРУЕТСЯ, ЧТО ЖДЕТ РАБОТНИКОВ?

В редакцию обратились бывшие работницы ОАО «Завод сухого обезжиренного молока» с вопросом: «Какой порядок расторжения трудового договора с работниками по инициативе нанимателя в случае ликвидации предприятия?»

Пункт 1 ст.42 ТК предоставляет право нанимателем на увольнение своих работников в случае ликвидации предприятия, а также при сокращении численности или штата работников.

Прекращение деятельности любого юридического лица может быть осуществлено в виде ликвидации либо в виде реорганизации.

При реорганизации юридического лица его имущество, права и обязанности полностью или частично переходят к новому юридическому лицу. В этом и состоит существенное отличие реорганизации от ликвидации, при которой происходит полное прекращение хозяйственной деятельности без перехода прав и обязанностей к другим юридическим лицам.

При ликвидации юридического лица все работники без исключения увольняются с работы. В приказах об их увольнении и трудовых книжках необходимо делать ссылку на ликвидацию юридического лица. Следует иметь в виду, что при ликвидации структурных подразделений юридического лица в приказе об увольнении и трудовой книжке делается запись со ссылкой не на ликвидацию, а на сокращение численности или штата работников, поскольку юридическое лицо продолжает свою хозяйственную деятельность.

При реорганизации юридического лица трудовые отношения нанимателя с работником (**с согласия работника**(!)) продолжаются. Прекратить их наниматель может по своей инициативе только в том случае, если происходит сокращение численности или штата работников, то есть уменьшение у нанимателя количества работников вследствие уменьшения числа определенных рабочих мест либо должностей. Если такого уменьшения нет, то сокращение численности или штата работников не может производиться.

Для установления факта сокращения численности или штата у реорганизованного юридического лица прежде всего необходимо сравнить штатные расписания и другие документы о численности работников до и после реорганизации.

При смене наименования структурных подразделений реорганизуемого юридического лица следует проверить должностные инструкции работников и другие документы для того, чтобы определить, произошло ли изменение трудовой функции по каждой из должностей (**сама по себе смена наименования подразделения не свидетельствует о наличии факта сокращения численности или штата работников(!)**).

В случае получения согласия на продолжение трудовых отношений в связи с реорганизацией в трудовые книжки работников вносится запись о новом названии юридического лица и о продолжении трудовых отношений (**если с письменного согласия работника он будет назначен (переведен) на другую работу, то эти сведения должны быть также внесены в трудовую книжку(!)**).

При увольнении по п.1 ст.42 ТК РБ наниматель обязан предупредить об этом работника(**с указанием конкретной даты увольнения (!)**). **Предупреждение следует оформить приказом и ознакомить с ним работника под роспись не позднее чем за два месяца до увольнения!**

При сокращении численности или штата нанимателям необходимо соблюдать требования ст.45 ТК. Она содержит обязательное условие для увольнения в связи с сокращением численности и штата — это преимущественное право или предпочтение на оставление на работе.


В первую очередь преимущественное право на оставление на работе предоставляется работникам с более высокой производственной квалификацией. В том случае, если производительность и квалификация равны, предпочтение отдается работникам: 1) заболевшим и перенесшим лучевую болезнь; 2) принимавшим участие в ликвидации последствий катастрофы на Чернобыльской АЭС; 3) работавшим в зоне эвакуации; 4) инвалидам.

При решении вопроса о предпочтении в оставлении на работе при сокращении численности или штата работников могут устанавливаться дополнительные условия в коллективных договорах и соглашениях (например, работникам, повышающим свою квалификацию без отрыва от производства в ВУЗах).

Следующим условием при увольнении согласно п.1 ст.42 ТК РБ является то, что оно допустимо только в том случае, если работника с его согласия невозможно перевести на другую работу(в т.ч. с переобучением). **Если возможность перевода была и работник соглашался на него, однако наниматель не предложил работнику другую работу и уволил его по сокращению численности или штата, то работник подлежит восстановлению на работе! Наниматель обязан предлагать работнику другую работу, даже не соответствующую ранее выполняемой, т.е. иную!**

При прекращении трудового договора в связи с ликвидацией юридического лица или сокращением численности или штата работников выплачивается выходное пособие в размере не менее трехкратного среднемесячного заработка(в случае, когда срок предупреждения по письменному соглашению сторон заменен денежной компенсацией в размере двухмесячного среднего заработка, она выплачивается вместе с выходным пособием**(!)**). Замена предупреждения денежной компенсацией (ч.4 ст.43) является правом, но не обязанностью нанимателя**(!).**

Нанимателям необходимо помнить, что увольнение работников по сокращению штатов в период временной нетрудоспособности или пребывания их в отпуске недопустимо**(!).** В этом случае суды восстанавливают работника на прежней работе.



© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

ДЗЯТЛАВА

ГАБЕЛЕН У ПАДАРУНАК

Нядаўна Дзятлава наведаў мастак з еўрапейскім імем Арсень Дваранін, наш зямляк, ураджэнец вёскі Малыя Краглі, які цяпер жыве ў Гомелі.

Ён пабываў у мясцовым гісторыка-краязнаўчым музеі і падарыў габелен ручнога ткацтва, на якім адлюстраваны Францыск Скарына. Гэта сумесная работа Арсеня Двараніна і яго жонкі Ірыны Данілавай. Музей падарыў мастаку кнігу "Памяць".

ПЕРАВЯРНУЛАСЯ МАШЫНА

У вёсцы Курпяшы Дзятлаўскага раёна адбылося дарожна-транспартнае здарэнне.

17-гадовы вадзіцель не справіўся з кіраваннем легкавой аўтамашыны і перавярнуўся. Сем чалавек, якія ехалі разам з ім, з цяжкімі пашкоджаннямі апынуліся ў бальніцы.

ПАДПАЛІЛА ДОМ

Дзятлаўская міліцыя ўзбудзіла крымінальную справу ў адносінах да грамадзянкі Т., якая жыве ў вёсцы Гярбелевічы.

Маладая жанчына была п'яная і падпаліла дом, што належыць мясцоваму калгасу "Лявонавічы".

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

ГРОДНО

СУД ЛИКВИДИРОВАЛ "РАТУШУ"

Решением областного суда города Гродно ликвидировано общественное объединение "Ратуша".

"Ратуша" ликвидирована за нарушение правил учета и хранения полиграфического оборудования — ризографа. Организации выносили предупреждение за использование ризографа в 2002 году и весной этого года. На основании двух предупреждений она и ликвидирована.

Алексей ШЕИН

МАСТЫ

КУДЫ ПАДЗЕЦЬ СМЕЦЦЕ?

На тэрыторыі суседняй з Мастамі вёскі Вялікія Сцяпанішкі ёсць толькі адна звалка смецця. Яна знаходзіцца ў канцы вёскі за чыгуначным пераездам. Не кожны вясковец мае транспарт, каб вывезці туды смецце са свайго падворка.

— Некалі звалка была недалёка ад нас. А цяпер вымушаны адвозіць смецце за два кіламетры. З малымі дзецьмі памперсы і падобныя рэчы хутка збіраюцца, а магчымасць так далёка вывозіць смецце ёсць не заўсёды, — скардзіцца маладая мама Тацццяна Дубатоўка з вуліцы Маладзёжнай.

Гады два назад існаваў сметнік каля калгаснага склепа. Звалка разраслася і хуткімі тэмпамі набліжалася да жылога сектара. Яе ліквідавалі з-за парушэння санітарных нормаў.

— Мы вывозім смецце ў бакі, якія стаяць у горадзе Масты. Так нам лацвей, бо ў канцы вёскі бываем рэдка, а ў горадзе — штодня, — говорыць 40-гадовая жанчына, што жыве ў самым пачатку Вялікіх Сцяпанішкаў.

Старшыня Мастоўскага сельскага савета У. Я.Пяцевіч пракаменціраваў сітуацыю так:

— Для стварэння новай звалкі патрэбна згода шматлікіх інстанцый. Прыходзілася плаціць за бульдозеры, каб навялі там парадак... Я прапанаваў жыхарам вёскі, каб вулічныя камітэты сабралі з кожнага дома па 500 рублёў. Можна было б наладзіць рэгулярны вываз смецця, як гэта робіцца ў прыватным сектары Мастоў.

Ірына ЛОЙКА

ГРОДНА

ГРОДЗЕНЦЫ Ў ВАРШАВЕ

На чарговым фэсце "Татальны раздалбон сістэмы '03", што адбываецца штогод у Варшаве, чакаюцца цікавыя выступы музычных камандаў з некалькіх краінаў.

Беларусь на фэсце будзе прадстаўляць гродзенскі стрытпанк гурт "Mister X ".

Андрэй МЯЛЕШКА

ГРОДНО

ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР ГОТОВИТСЯ ОТМЕТИТЬ СВОЕ 875-ЛЕТИЕ

При отделе культуры Гродненского горисполкома создан оргкомитет по проведению торжеств по случаю 875-летия города. В его состав вошли известные люди Гродно.

Свой юбилей город отметит 20 сентября. Во время праздничных мероприятий пройдет фестиваль молодых исполнителей "Голоса Европы". Планируется, что на праздник в Гродно приедут гости из России, Франции, Великобритании, Польши, Германии и Литвы.

Сейчас в городе ведутся ремонтные и строительные работы, которые должны завершиться до 20 сентября.

Андрей МЕЛЕШКО



Фота Аляксандра ГРЫГОР'ЕВА з архіва "Ад я да Я"

▪ Гродно в осенних красках

У ГРОДНЕ ПРОЙДЗЕ ДЭМАНСТРАЦЫЯ ЯПОНСКАЙ ЧАЙНАЙ ЦЫРЫМОНІІ

Дзень культуры Японіі пройдзе ў Дзіцячай цэнтральнай бібліятэцы, што на вуліцы Цітова. У праграме – дэманстрацыя чайнай цырымоніі і паказ відэафільма пра краіну ўзыходзячага сонца.

Для прэзентацыі сваёй культуры ў Гродна прыехалі чацвёра грамадзян Японіі, прадстаўнікі дабрачыннага фонду "Чыра". Фонд быў створаны ў Японіі пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС з мэтай дапамогі беларусам і для папулярызацыі японскай культуры ў нашай краіне. Падтрымаў мерапрыемства інфацэнтр японскай амбасады ў Мінску.

— Гродзенская дзіцячая бібліятэка сябруе з інфацэнтрам японскай амбасады з 2000 года, — распавядае дырэктар бібліятэчнай сістэмы горада Гродна Галіна Рыбалка. – Дзякуючы гэтым стасункам, нашы фонды рэгулярна папаўняюцца газетамі і часопісамі з інфармацыяй пра Японію.

З Гродна японцы забяруць з сабой выставу дзіцячых малюнкаў на тэму "Я і мая сям'я". У Японіі журы вызначыць лепшыя творы і вышле пераможцам памятныя сувеніры.

Юлія ДАРАШКЕВІЧ

ГРОДНО

БОЛЕЗНЬ НАСТУПАЕТ

По данным исполняющего обязанности главного врача Гродненского городского центра гигиены и эпидемиологии Ирины Касперчик, каждый день в областном центре медики фиксируют по 1-2 заболевших серозным менингитом. "Но это спорадические случаи, вспышки заболевания нет", — утверждает специалист.

По словам Александра Хильмановича, главного врача Гродненского областного инфекционного клинического госпиталя, по состоянию на 19 августа на стационарном лечении находится 13 больных серозным менингитом, среди них 7 детей.

Никакие дополнительные меры профилактики менингита в городе не принимаются: "В этом пока нет необходимости. Мы примем дополнительные меры предостережения тогда, когда количество заболевших в день будет составлять 15 человек", — сообщила Ирина Касперчик.

Серозный менингит может быть вызван энтеровирусной инфекцией. Заболевание передается преимущественно воздушно-капельным путем, а также при бытовых контактах. Инкубационный период заболевания составляет неделю, курс лечения — 21 день.

В мае этого года в Гродно уже была зафиксирована вспышка серозного менингита. Тогда заболело около 200 человек. Медики так и не назвали официальную причину вспышки заболевания, как и не нашли очаг заражения. По одной из версий, источником энтеровируса стала питьевая вода.

Юлия ДОРОШКЕВИЧ

ЗЭЛЬВА

ПРЫСВЕЧАНЫ ГІСТОРЫІ ПАСЁЛКА

У Зэльве выйшаў з друку восьмы нумар вучнёўска-бацькоўска-настаўніцкай газеты "Зяльвянчка".

Нумар цалкам прысвечаны 745-годдзю ўзгадвання пасёлка ў Іпацьеўскім летапісе. Ён адкрываецца матэрыялам Юрыя Качука "Наша Зэльва", у якім аўтар расказвае пра гістарычны шлях Зэльвы, пачынаючы ад Данілы Галіцкага, які "зьдзейсніў паход на Навагародскую зямлю, захапіў Ваўкавыск, пасьля пасла ў атрады на чале з ваяводам Міхаілам на Зэльву, а сына Льва – на Гарадзен", і заканчваючы паэткай Ларысай Геніюш, якая жыла і пахавана на зэльвенскай зямлі.

Юлія Качук распавядае пра Зэльвенскі Аннескі кірмаш, які штогод праходзіў у Зэльве, пачынаючы з канца XVIII – пачатку XIX стагоддзяў. А Таццяна Жогла расказвае пра 12 ліпеня 1944 года, калі Зэльва вызвалялася ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У "Зяльвянчцы" надрукаваны таксама вершы Ларысы Геніюш і Юркі Голуба, а таксама здымкі Зэльвы 30-х гадоў мінулага стагоддзя і сённяшнія.

Сяргей ЧЫГРЫН

ГРОДНО

ИУДЕИ И ВЛАСТИ ДОГОВОРИЛИСЬ

В Минске состоялось подписание соглашения между председателем Гродненского облисполкома Владимиром Савченко и главным раввином Иудейского религиозного объединения в Республике Беларусь (ИРО) Сендером Урицким по урегулированию конфликта вокруг строительства спортивного сооружения на месте старинного еврейского кладбища в Гродно.

Как сообщил БелаПАН президент ИРО Юрий Дорн, соглашение предусматривает прекращение земляных работ в районе стадиона и прилегающей к нему территории. "Этот очень важный пункт документа уже выполняется, и с утра 19 августа со строительной площадки были убраны два экскаватора, которые проводили здесь земляные работы", — сказал Ю.Дорн. По его словам, соглашением предусмотрен особый статус для зоны, прилегающей к кладбищу. "Здесь запрещено проведение какого-либо строительства, а благоустройство этой территории предполагается вести без нарушения земляного покрова. В любом другом случае все виды строительных работ на этой территории будут согласовываться с еврейской общиной города", — отметил президент ИРО. Вместе с тем, по его словам, соглашение предусматривает возвращение на прежнее место земли из захоронений, перезахоронение останков на ныне действующем еврейском кладбище города, а также увековечение старинного еврейского кладбища установкой мемориального знака. "Мы планируем его возвести в начале будущего года после завершения строительных работ", — заметил Ю.Дорн. Кроме того, по его словам, Гродненский исторический архив в месячный срок должен передать ИРО копии всех документов, относящихся к открытию кладбища, а также копии списков похороненных на нем людей. "В соглашение не вошло предложение об укрытии бетоном карьера по улице Новой, куда сбрасывалась земля с останками захороненных. Однако В.Савченко обещал решить этот вопрос", — сообщил Ю.Дорн.

Напомним, что на этом кладбище, которое действовало с начала XVII века на протяжении 250 лет, было похоронено около 14 тысяч человек, в том числе известные раввины (иудейские священнослужители). В начале нынешнего года на территории кладбища начались строительные работы, а спустя два месяца ИРО и другие еврейские религиозные организации страны забили тревогу, посчитав недопустимым возведение стадиона из надмогильных плит и использование для строительных нужд земли из захоронений. Так как переговоры руководства ИРО с властями Гродненской области оказались безрезультатными, многие международные еврейские организации обратились в ФИФА и УЕФА с требованием бойкотировать участие белорусских футболистов в международных соревнованиях. Вместе с тем, Конгресс США стал рассматривать предложение об обращении в Международный олимпийский комитет с просьбой бойкотировать Беларусь на Олимпийских играх 2004 года в Афинах (Греция), если строительство стадиона не будет прекращено. Кроме того, иудеи и представители международных еврейских организаций провели в Великобритании и Бельгии пикетирование дипломатических миссий Беларуси.

Марат ГОРЕВОЙ

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

© PDF: Kamunikat.org 2017 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2017

САТЫРЫЧНЫМ ПЯРОМ

ЗА БУГРОМ ВАДА МАКРЭЙШАЯ

Тых адважных кабет, якія на скаку спынялі каня ці здуру перліся ў пылаючую хату, у той час, калі мужчыны пілі віно ды гралі ў карты, ужо няма. Ім на змену прыйшлі жанчыны-турысткі. Напакаваўшы торбы розным дабром ад спірту "Раяль" да мужчынскіх порткаў, яны шастаюць па Еўропе ў пошуку заробку. Іх ведаюць у Польшчы і Літве, бо, прадаўшы свой тавар, купляюць у паноў усё, што ўлазіць у торбы, і потым прадаюць землякам. Але і гэты бізнес памалу адыходзіць у нябыт. Цяпер блакітная мара нашых "турыстак" — украінскі горад Хмяльніцкі. Яны штурмуюць яго з такім імпэтам, як некалі французы бралі Бастылію.

Яшчэ некалькі тыдняў таму па пятніцах з Дзятлава адпраўляўся адзін аўтобус з мясцовымі падарожніцамі. І то не кожную пятніцу. І не ўсякі аўтобус быў запоўнены. Цяпер жа ходзяць штотыдзень па два. Дзевяноста "турыстак" з аднаго маленькага гарадка едуць на Украіну.

— Каб ты бачыла, якое там усё таннае! — угаворвала мяне знаёмая. — Сабе набярэш, яшчэ і прадаць можна.


Сэрца якой жанчыны не ўстаіць перад такой спакусай! Тым больш, што на Украіне я не была ні разу і сонечны Хмяльніцкі бачыла хіба толькі ў сне.

Першы раз аўтобус быў камфартабельны, прыгожы. З кандыцыянерам, відзікам, індывідуальным асвятленнем. У ім можна было нават папіць кавы ці чаю з цукрам. Усё гэта ўваходзіла ў кошт білета. А білет, між іншым, каштуе зусім нядорага: туды і назад усяго 29 тысяч рублёў плюс дзве тысячы на экалогію. За такія мізэрныя грошы вы будзеце пятнаццаць гадзін трэсціся туды ды столькі ж назад. Для недасведчаных, а такіх ужо засталося няшмат, тлумачу больш падрабязна: а 16 гадзіне аўтобус выходзіць з Дзятлава. Уладкаваўшы справы на мытні ды на граніцы, у сем гадзін раніцы ён ужо ў Хмяльніцкім (усю ноч у дарозе). Там закупляем тавар і а 13 гадзіне ў суботу ад'язджаем назад. Зноў паўдня і ноч едзем і толькі нядзельнай раніцай маем магчымасць удыхнуць салодкі дым Айчыны.

Кірмаш у Хмяльніцкім і сапраўды вялізны. За дзень не абыдзеш. Я нават заблудзілася, бо разгубілася ад такой колькасці самых розных тавараў. Танная бялізна, дываны, адзенне, абутак. Нашы кабеты валакуць адтуль шпалеры, коўдры, пасцельную бялізну. Словам, няма таго, што не грузілі б у аўтобусы і не перлі ў Беларусь. Такіх як мы, "турыстаў", там, напэўна, больш, чым саміх украінцаў. Дарэчы, яны вельмі добразычлівыя, спагадлівыя, словам, з імі прыемна мець справу.

Калі ехалі назад, на мытні прасталі чатыры гадзіны. Ноч. Стомленасць. Хваляванне, што псуюцца ў вёдрах абрыкосы, якіх мы купілі на кампот ды варэнне. А яшчэ набралі памідораў, перцу, кавуноў. Калі нас адпусцілі мытнікі ды пагранічнікі, то сапсаваўся аўтобус. Жанчыны выйшлі з машыны і лёгка папхнулі яе. І так пхаць трэба было тры разы. Нарэшце, завёўся стабільна, але перасталі зачыняцца дзверы. Ну, тэхніка ёсць тэхніка. З ёй без прыгод не пражывеш.

Ужо дома, калі адпачылі, падлічылі на калькулятарах расход і прыход, парадавалі дамашніх абноўкамі, прыйшлі да высновы, што трэба ехаць яшчэ.


Фота Тацяны ПЛАХЕТКА

■ Там купіла — тут прадасць

На гэты раз аўтобус з чаем і кавай дастаўся тым, хто адпраўляўся ў Хмяльніцкі першы раз, а нам далі бразгач на калёсах, які на далёкіх і блізкіх дарогах растрос усе свае амартызатары. Ехалі, як на возе, прычым не на гумавым, а на драўляным хаду. Кожная выбоінка давала аб сабе знаць моцным штуршком, аж калола ў пяты.

Але пра ўсё забыліся, калі ў Хмяльніцкім выскачылі на кірмашовую плошчу. Усімі авалодаў нейкі незразумелы азарт, нібыта перад паляваннем. Я нагледзела ў нейкай гандляркі летні касцюмчык і папрасіла яго памераць. Апранула. Не падышоў.

— Што ж ты мне нарабіла! Бачыш, замок ужо адарваўся.

